www.baj.by

АСАЦЫЯЦЫЯ ЖУРНАЛІСТАЎ БЕЛАРУСКАЯ

ЭЛЕКТРОННЫ БЮЛЕТЭНЬ

# СМІ Ў БЕЛАРУСІ

№4 (70), жнівень–кастрычнік 2022



© Brett Sayles, pexels.com

№4 (70), жнівень-кастрычнік 2022

# ЗМЕСТ:

Кантэкст .................................... 3

Уголовное преследование журналистов .............................. 4

Ціск на журналістаў і медыя .................................. 9

Ужыванне антыэкстрэмісцкага заканадаўства ............ 11

Абмежаванне доступу да інфармацыі ............................... 14

Падзеі ў дзяржаўным медыясектары ................................ 17

Беларускіх журналістаў па-ранейшаму пераследавалі за прафесійную дзейнасць; скарачалася прастора для функцыянавання незалежных СМІ.

- *32 медыяпрацаўнікі знаходзіліся ў зняволенні на канец кастрычніка.*
- *Было вынесена 9 прысудаў па крымінальных справах – журналісты атрымалі тэрміны пазбаўлення волі ад 3 да 14 гадоў. Новыя крымінальныя справы распачатыя ў дачыненні да пяці журналістаў.*
- *Журналісты зазналі затрыманні, прыцягненне да адміністрацыйнай адказнасці і іншыя віды ціску.*
- *Антыэкстрэмісцкае заканадаўства, як і раней, з'яўлялася зброяй барацьбы з незалежнай прэсай – перш за ўсё як нагода для блакіроўкі доступу да анлайн-СМІ і прыцягнення да адказнасці за распаўсюд інфармацыі. Першая крымінальная справа па новым артыкуле Крымінальнага кодэкса 130-2 (адмаўленне генацыду беларускага народа) была распачатая ў сувязі з публікацыямі ў незалежных СМІ.*
- *У выніку палітыкі ўладаў працягвалася скарачэнне незалежных крыніцаў інфармацыі ўнутры Беларусі – яны вымушана спынялі сваю дзейнасць.*
- *Дзейнічае цэнзура ў дачыненні да публікацыяў СМІ, уключаючы дзяржаўныя.*

# Крымінальны пераслед журналістаў



3 жніўня Гомельскі абласны суд прысудзіў журналістцы польскага тэлебачання, былой супрацоўніцы тэлеканала «Белсат» Ірыне Слаўнікавай пяць гадоў пазбаўлення волі па двух крымінальных артыкулах: па частцы 1 артыкула 342 (арганізацыя групавых дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак, альбо актыўны ўдзел у іх) і частцы 1 артыкула 361-1 (стварэнне экстрэмісцкага фарміравання ці ўдзел у ім)[1].

6 верасня Брэсцкі абласны суд прызнаў экс-журналістку БелТА Іну Можчанка вінаватай у абразе прадстаўніка ўлады (артыкул 369 Крымінальнага кодэкса) і распальванні сацыяльнай варожасці (частка 1 артыкула 130 Крымінальнага кодэкса) і прысудзіў ёй тры гады калоніі строгага рэжыму з адбываннем пакарання на агульным рэжыме. Іна Можчанка была затрыманая ў верасні 2021 года ў сувязі з яе негатыўным выказваннем пра загінулага супрацоўніка КДБ у сацсетках[2].

[1] https://baj.by/be/content/iryne-slaunikavay-pryznachyli-5-gadou-znyavolennya
[2] https://spring96.org/be/news/108974

14 верасня журналіста-расследавальніка Дзяніса Івашына асудзілі ў закрытым працэсе па двух артыкулах: 365 (умяшальніцтва ў дзейнасць супрацоўніка органаў унутраных спраў) і 356 (частка 1) (дзяржаўная здрада). Камітэт дзяржаўнай бяспекі абвінаваціў журналіста ў супрацоўніцтве з украінскай выведкай – украінскімі дыпламатамі. Ён быў асуджаны на 13 гадоў і 1 месяц пазбаўлення волі і аштрафаваны на 4800 рублёў. Ён таксама павінен выплаціць кампенсацыю дзевяці пацярпелым у памеры 2000 рублёў кожнаму. Хто гэтыя пацярпелыя, грамадскасці невядома. Увогуле журналіст павінен заплаціць больш за 9000 долараў[3].

28 верасня Мінскі гарадскі суд агучыў прысуд па справе экс-журналісткі Белтэлерадыёкампаніі, лаўрэаткі дзяржаўных прэміяў за дасягненні ў прафесіі Ксеніі Луцкіной – восем гадоў пазбаўлення волі. Яна была затрыманая 22 снежня 2020 года, у адзін дзень з супрацоўнікамі беларускага «Прэс-клуба». Першапачаткова іх усіх абвінавачвалі ў нявыплаце падаткаў, а пасля таго, як справу «Прэс-клуба» зачынілі і выпусцілі ўсіх яго фігурантаў, якія напісалі прашэнне пра памілаванне, Луцкіной было прад'яўленае новае абвінавачанне – змова з мэтай захопу дзяржаўнай улады неканстытуцыйным шляхам (артыкул 357 Крымінальнага кодэкса), матываванае тым, што яна «ўзначаліла групу інфармацыйнага забеспячэння і супрацьдзеяння дзяржаўным СМІ» ў Каардынацыйнай радзе беларускай апазіцыі[4].

6 кастрычніка, пасля чатырох месяцаў слуханняў у закрытым рэжыме, завяршыўся суд па справе БелаПАН (незалежнага

---

[3] https://news.zerkalo.io/economics/11593.html
https://baj.by/ru/content/zhurnalistu-denisu-ivashinu-dali-13-let-kolonii-ego-obvinyali-v-gosizmene

[4] https://baj.by/be/content/palitznyavolenuyu-zhurnalistku-kseniyu-luckinu-asudzili-na-8-gadou-kalonii




інфармацыйнага агенцтва, якое было разгромлена сілавікамі ўлетку 2021 года і пазней прызнана «экстрэмісцкім фарміраваннем»). Медыяменеджару Андрэю Аляксандраву прызначылі 14 гадоў калоніі, яго жонцы Ірыне Злобінай – 9 гадоў, былому дырэктару агенцтва БелаПАН Дзмітрыю Наважылаву – 6 гадоў, галоўнаму рэдактару і дырэктару БелаПАН Ірыне Леўшынай – 4 гады:

*Андрэя Аляксандрава і Ірыну Злобіну абвінавачвалі па частцы 2 артыкула 342 Крымінальнага кодэкса ў падрыхтоўцы «не менш за 260 асобаў для ўдзелу ў групавых дзеяннях, якія груба парушаюць грамадскі парадак» (так следства трактавала аплату імі штрафаў, рахункаў за паслугі адваката і да т.п. для людзей, якія ўдзельнічалі ў поствыбарных пратэстах);*

*іх жа абвінавацілі па частцы 1 артыкула 356 Крымінальнага кодэкса (здрада дзяржаве) за садзейнічанне фонду ByHelp у дзейнасці, «накіраванай на прычыненне шкоды нацыянальнай бяспецы Рэспублікі Беларусь»;*

*Андрэя Аляксандрава, Дзмітрыя Наважылава і Ірыну Леўшыну абвінавацілі ў стварэнні экстрэмісцкага фарміравання з ліку працаўнікоў БелаПАН і іншых асобаў,*

*а таксама ў кіраўніцтве такім фарміраваннем па частцы 1 артыкула 361-1 Крымінальнага кодэкса;*

*Андрэя Аляксандрава і Дзмітрыя Наважылава – ва ўхіленні ад выплаты падаткаў БелаПАН па частцы 2 артыкула 243 Крымінальнага кодэкса (у Следчым камітэце заяўлялі, што супрацоўнікі БелаПАН нібыта ўхіліліся ад выплаты падаткаў на 449 тысячаў рублёў за шэсць гадоў і атрымалі схаванае фінансаванне ад замежных арганізацыяў на суму ў 1,6 млн доляраў з 2014 года)*[5].

Мінскі гарадскі суд 26 кастрычніка агучыў прысуд галоўнаму рэдактару анлайн-выдання «Штодзённік», журналісту-расследавальніку Сяргею Сацуку. Ён быў асуджаны да васьмі гадоў пазбаўлення волі ў калоніі ўзмоцненага рэжыму, бо быў прызнаны вінаватым у атрыманні хабару ў буйным памеры (частка 2 артыкула 430 Крымінальнага кодэкса), перавышэнні службовых паўнамоцтваў (артыкул 426), а таксама ў распальванні сацыяльнай варожасці (артыкул 130)[6].

27 кастрычніка ў Мінскім гарадскім судзе журналіст Алесь Любянчук, які раней супрацоўнічаў з тэлеканалам «Белсат», быў прызнаны вінаватым па артыкуле 361-1 Крымінальнага кодэкса (стварэнне экстрэмісцкага фарміравання ці ўдзел у ім) і асуджаны да 3 гадоў пазбаўлення волі[7].

---

5 https://baj.by/ru/content/ot-chetyreh-do-14-let-kolonii-v-minske-oglasili-prigovor-po-delu-belapan

6 https://baj.by/ru/content/zhurnalista-sergeya-sacuka-prigovorili-k-vosmi-godam-kolonii-usilennogo-rezhima

7 https://baj.by/ru/content/zhurnalista-alesya-lyubenchuka-prigovorili-k-3-godam-lisheniya-svobody

**Працягваўся крымінальны пераслед журналістаў – заведзены новыя крымінальныя справы.**

Іван Мураўёў, журналіст, аператар і фатограф, быў затрыманы 29 жніўня ў Мінску супрацоўнікамі Следчага камітэта, пасле чаго яму было прад'яўленае абвінавачанне па частцы 3 артыкула 361-1 Крымінальнага кодэкса (удзел у экстрэмісцкім фарміраванні). Журналіст знаходзіцца ў СІЗА[8].

14 верасня ў Гомелі быў затрыманы журналіст Яўген Меркіс. Першапачаткова паведамлялася, што ягоная справа датычыцца нібыта заклікаў да санкцый. Пазней стала вядома, што журналісту прад'яўленае абвінавачанне па артыкуле 361-4 Крымінальнага кодэкса (садзейнічанне экстрэмісцкай дзейнасці)[9].



Журналістам-супругам Аляксандру Лычаўку і Сняжане Інанец, затрыманым 6 кастрычніка, былі прад'яўленыя абвінавачанні па артыкуле 342 Крымінальнага кодэкса (арганізацыя і падрыхтоўка дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак, альбо актыўны ўдзел у іх) у сувязі з удзелам у акцыях пратэсту ў 2020 годзе і падпіскай на «дэструктыўныя» Telegram-каналы[10].

[8] https://prisoners.spring96.org/ru/person/ivan-murauiou

[9] https://www.svaboda.org/a/32035665.html

[10] https://mediazona.by/news/2022/10/07/journalists
https://baj.by/en/content/police-affiliated-telegram-channel-published-video-detained-journalists-aliaksandr-lychauka

Супраць Дзмітрыя Семчанкі, былога супрацоўніка АНТ, завялі крымінальную справу аб распальванні варожасці (частка 1 артыкула 130 Крымінальнага кодэкса). 16 верасня ён быў затрыманы і двойчы асуджаны да адміністрацыйнага арышту, пасля чаго яму было прад’яўленае абвінавачанне. У жніўні 2020 года Семчанка звольніўся з тэлеканала АНТ, дзе ўзначальваў прэзідэнцкі пул журналістаў, у знак пратэсту супраць гвалту[11].

У жніўні журналісту і актывісту Саюза палякаў Анджэю Пачобуту прад’явілі новае абвінавачанне, акрамя першапачатковага абвінавачання ў «распальванні варожасці» (артыкул 130 Крымінальнага кодэкса). Яму дадаткова інкрымінавалі «заклікі да абмежавальных мераў (санкцый), накіраваных на прычыненне шкоды нацыянальнай бяспецы» (артыкул 361 Крымінальнага кодэкса)[12].

# Ціск на журналістаў і медыя

За тры месяцы БАЖ зафіксаваў 13 затрыманняў і 12 вобшукаў, якія закранулі журналістаў; 8 разоў журналістаў асуджалі да адміністрацыйных арыштаў і адзін раз да штрафу. Акрамя таго, прадстаўнікі сілавых ведамстваў выклікалі журналістаў для апытання, наведвалі дамы журналістаў, якія з’ехалі з Беларусі[13].

---

[11] https://mediazona.by/news/2022/10/26/crimesemchenko

[12] https://baj.by/ru/content/andzheyu-pochobutu-predyavili-obvinenie-v-prizyvah-k-sankciyam-ili-inym-deystviyam

[13] https://baj.by/be/analytics/represii-suprac-zhurnalistau-u-2022-godze-tablica-spis-znyavolenyh

23 жніўня рэдактар сайта «Народныя навіны Віцебска» Сяргей Серабро быў выкліканы ў Віцебскі абласны аддзел ГУБАЗіК (Галоўнае ўпраўленне па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю і карупцыяй Міністэрства ўнутраных спраў), дзе на працягу гадзіны яго апытвалі, а затым узялі пісьмовыя тлумачэнні наконт асвятлення пратэсных шэсцяў пасля прэзідэнцкіх выбараў у 2020 годзе[14].

Масіраваны пераслед зазнала незалежнае інтэрнэт-выданне «Бабруйскі кур'ер» і яго галоўны рэдактар Анатоль Санаценка. У сярэдзіне верасня ён быў затрыманы і двойчы асуджаны да адміністрацыйнага арышту. У яго і яго калегаў прайшлі вобшукі і была канфіскаваная тэхніка. 19 верасня быў заблакаваны сайт «Бабруйскаго кур'ера», а 26 верасня суд Бабруйскага раёна і горада Бабруйска прызнаў ягоны кантэнт «экстрэмісцкімі матэрыяламі». 6 кастрычніка ў Telegram-канале мясцовага дзяржаўнага радыё «ЗефірFM» з'явіўся пяціхвілінны сюжэт пра газету «Бабруйскі кур'ер» і яе супрацоўнікаў, тэкст у якім чытаў галоўны рэдактар праўладнай газеты «Бабруйскае жыццё» Мікалай Сілкоў. Асноўная ўвага ў сюжэце надавалася Анатолю Санаценку, які ў той час адбываў



[14] https://baj.by/be/content/u-syargeya-serabro-uzyali-pismovyya-tlumachenni-yak-yon-asvyatlyau-padzei-2020-ga-na-svaim

адміністрацыйны арышт. Яго, у прыватнасці, бяздоказна абвінавачвалі ў выпрошванні грошай у ЗША і Германіі, публікацыі «фэйкаў» пра тэракт у мінскім метро і сувязях з тэлеканалам «Белсат» (прызнаным «экстрэмісцкім фарміраваннем»)[15].

У канцы кастрычніка быў затрыманы Андрэй Фамін, які прызнаў, што быў рэдактарам і аўтарам артыкулаў для сеткі пратэсных газетаў «Веснікі», якія выдаваліся і распаўсюджваліся актывістамі лакальных ініцыятыў (у сакавіку 2022 года яна аб'ядналася ў газету «Беларускі веснік»)[16].

# Ужыванне антыэкстрэмісцкага заканадаўства

26 жніўня 2022 года супраць анлайн-медыя «Флагшток» і Zerkalo.io была распачатая першая ў краіне крымінальная справа па новым артыкуле 130-2 (адмаўленне генацыду беларускага народа). Прычынай стала публікацыя, у якой сцвярджалася, што на адной з мапаў Гомеля, апублікаванай на сайце мясцовых уладаў, ёсць паметка пра месца масавых пахаванняў ахвяраў палітычных рэпрэсій 1937 года, пры гэтым, паводле версіі пракуратуры, у дадзеным пахаванні знаходзяцца

[15] https://baj.by/be/content/galounaga-redaktara-bobruyskogo-kurera-asudzili-drugi-raz-cyaper-na-14-sutak

https://baj.by/be/content/prapagandysty-babruyska-znyali-abrazlivy-videasyuzhet-pra-nezalezhnuyu-gazetu-bobruyskiy

[16] https://baj.by/ru/content/zaderzhali-muzhchinu-kotorogo-obvinyayut-v-sozdanii-protestnogo-samizdata

ахвяры нацыстаў. Праз некаторы час «рэзанансная» мапа была выдаленая, а супраць двух СМІ распачатая крымінальная справа[17].

Ваеннаму эксперту Ягору Лебядку, якога затрымалі ў Смалявічах 13 ліпеня і спачатку арыштавалі на 15 сутак, было прад’яўленае абвінавачанне ў садзейнічанні экстрэмісцкай дзейнасці за каментары для «Еўрарадыё» (прызнанага «экстрэмісцкім



фарміраваннем») па артыкуле 361-4 Крымінальнага кодэкса. У кастрычніку праўладныя крыніцы паведамілі, што супраць яго была заведзеная яшчэ адна крымінальная справа па прызнаку паўторнасці (нібыта «інтэрв’ю экстрэмістам утварае асобны склад злачынства»). Верагодна, гаворка вядзецца пра частку 2 таго ж артыкула. Пры гэтым Лебядок

[17] https://baj.by/be/content/genprakuratura-raspachala-kryminalnuyu-spravu-suprac-flagshtoka-i-zerkala

быў затрыманы за тыдзень да таго, як радыёстанцыя атрымала статус «экстрэмісцкага фарміравання»[18].

**Працягвалася ўключэнне сайтаў і старонак у сацсетках, якія належаць незалежным выданням, у пералік экстрэмісцкіх матэрыялаў, а іх супрацоўнікаў, якія знаходзяцца пад следствам і асуджаныя па пэўных крымінальных справах, – у спісы «экстрэмістаў» і «тэрарыстаў».**

«Экстрэмісцкімі матэрыяламі» былі прызнаныя «люстэркавы» сайт і сацыяльныя сеткі выдання «Хартыя’97», група ў Facebook і YouTube-канал выдання Hrodna.life, сайт «Барысаў-інфа», старонка ў «Аднакласніках» выдання EX-PRESS.BY, Telegram-чат і сацыяльныя сеткі выдання «Флагшток», Telegram-каналы «Медыя-Палессе» і «Першы Рэгіён», сайт «Бабруйскага кур’ера», а таксама канал «ТОК | TALK», які належыць выданню «Наша Ніва» і на якім публікуюцца інтэрв’ю з чальцамі грамадзянскай супольнасці. Таксама ў спіс патрапілі два сайты польскай радыёстанцыі PolskieRadio. Пад забарону патрапіў сайт, што публікуе стужку рэгіянальных навінаў, якія можна ўбачыць у беларускім сегменце Telegram, пры гэтым не падпісваючыся на самі каналы. Да «экстрэмісцкіх матэрыялаў» быў аднесены відэаролік Беларускага расследавальніцкага цэнтра пра «справу артапедаў», Telegram-канал экалагічнай арганізацыі «Экадом» і навінавы сайт «Зялёны партал»[19].

«Экстрэмісцкімі фарміраваннямі» паводле рашэння МУС стала «група грамадзянаў, аб’яднаных пры дапамозе інтэрнэт-сайтаў, Telegram-каналаў і сацыяльных сетак інфармацыйнага рэсурсу

---

[18] https://baj.by/be/content/novaya-sprava-suprac-lebyadka-na-vayskovaga-aglyadalnika-hochuc-pavesic-use-intervyu

[19] https://humanconstanta.org/obzor-borby-s-ekstremizmom-v-belarusi-za-iyul-sentyabr-2022/
https://baj.by/be/content/video-belorusskogo-rassledovatelskogo-centra-o-dele-ortopedov-priznali-ekstremistskim

“Хартыя’97”», а таксама «група грамадзянаў, аб’яднаных у тым ліку пры дапамозе Telegram-чата “Белсатаўшчына”», верагодна, звязанага з тэлеканалам «Белсат». Да «асобаў, датычных да экстрэмісцкай дзейнасці» былі аднесеныя журналістка Кацярына Андрэева і філосаф Уладзімір Мацкевіч[20].

КДБ уключыў у лік «асобаў, датычных да тэрарыстычнай дзейнасці» Анджэя Пачобута, журналіста і аднаго з лідараў Саюза палякаў Беларусі, а таксама былых супрацоўніцаў TUT.BY, якія знаходзяцца пад следствам: галоўнага рэдактара Марыну Золатаву, дырэктара Людмілу Чэкіну, журналістак Вольгу Лойку і Алену Талкачову[21].

# Абмежаванне доступу да інфармацыі

Перыяд адзначыўся ўнясеннем зменаў у працэдуру блакіроўкі непажаданых сайтаў, а таксама ў арганізацыю доступу спецслужбаў да кантэнту інтэрнэт-рэсурсаў.

23 верасня была апублікаваная пастанова Аператыўна-аналітычнага цэнтра пры прэзідэнце (ААЦ) (набыла моц праз месяц пасля яе афіцыйнага апублікавання). Калі раней інтэрнэт-правайдары правяралі спіс абмежаванага доступу адзін раз у дзень, то цяпер яны абавязаныя рабіць гэта кожныя тры гадзіны на працягу дня і абмяжоўваць

[20] https://www.mvd.gov.by/ru/news/8642
[21] http://kgb.by/ru/perechen-inf-ru/

доступ да таго ці іншага «забароненага» інтэрнэт-рэсурсу на працягу чатырох гадзінаў з моманту ўнясення ў спіс[22].

18 кастрычніка Аляксандр Лукашэнка падпісаў указ № 368 «Аб узаемадзеянні аператараў электрасувязі, пастаўшчыкоў паслуг электрасувязі і ўладальнікаў інтэрнэт-рэсурсаў з органамі, якія ажыццяўляюць аператыўна-вышуковую дзейнасць», які прадугледжвае стварэнне спецыяльнай інфармацыйнай сістэмы электроннага ўзаемадзеяння са спецслужбамі. У якасці тых, хто можа сачыць за карыстальнікамі, вызначаныя ААЦ і КДБ. Калі раней сачэнне ў рэжыме рэальнага часу вялося толькі за карыстальнікамі аператараў электрасувязі, то цяпер яно стане абавязковым для пастаўшчыкоў паслуг электрасувязі і ўладальнікаў інтэрнэт-рэсурсаў. Тыя з іх, якіх вызначаць ААЦ і КДБ, будуць абавязаныя ў трохмесячны тэрмін зарэгістравацца ў сістэме і настроіць свае рэсурсы для бесперашкоднага доступу сілавікоў у рэжыме анлайн[23].


Вася Ложкин «Родина слышит»
Источник: reform.by

Працягваліся блакіроўкі незалежных анлайн-СМІ і сайтаў грамадскіх арганізацыяў. Так, былі заблакаваныя сайты выданняў «Вячэрні Бабруйск», «Бабруйскі кур’ер», «Народная Воля», CityDog.io, навінавыя сайты belprauda.com і s13.ru, сайт «Польскага радыё», сайт экалагічнай накіраванасці

[22] https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=T22205145&p1=1&p5=0
[23] https://reform.by/334565-vladelcev-sajtov-zastavjat-podkljuchitsja-k-sorm

«Зялёны партал», а таксама сайт праваабарончай ініцыятывы «Журналісты за талерантнасць», «люстэрка» сайта Беларускай асацыяцыі журналістаў[24].

Сайт навінаў пра Мінск і Беларусь Blizko.by быў часова заблакаваны па рашэнні Міністэрства інфармацыі з-за ўзгадвання ў адной з публікацыяў блогера Антона Матолькі, уключанага ў пералік «тэрарыстаў». Пасля разблакавання на сайце зніклі палітычныя навіны, у тым ліку архіўныя[25].

Сацыяльная сетка «УКантакце» заблакавала шэраг старонак і групаў беларускіх незалежных СМІ – «Хартыі’97» і «Флагштока» паводле скаргі Міністэрства інфармацыі Беларусі, «Люстэрка» і беларускай «Медыязоны» – па патрабаванні Генеральнай пракуратуры Расіі[26].

З 1 жніўня спыніў вяшчанне тэлеканал «БелБізнесЧэнэл», паведаміўшы пра гэта на сваёй старонцы ў Facebook без указання прычынаў. Гэта быў адзіны ў Беларусі тэлеканал пра бізнес,

---

[24] https://humanconstanta.org/obzor-borby-s-ekstremizmom-v-belarusi-za-iyul-sentyabr-2022/

https://nashaniva.com/297671

https://citydog.io/post/citydog-blakujuc/

https://baj.by/be/content/dostup-da-internet-resursu-s13ru-abmezhavany-mininfarmam

https://j4t.info/2022/10/04/u-belarusi-zablakavanyi-sayt-j4t-info-naystareyshay-arganizatsyii-yakaya-pratsue-na-zmyanshenne-movyi-varazhnechyi-i-nyanavistsi-u-medyiyah

[25] https://baj.by/be/content/mininfarm-razblakavau-sayt-blizkoby-cyaper-tam-nyama-palityki

[26] https://baj.by/be/content/gruppu-hartii-97-i-gomelskogo-flagshtoka-v-vkontakte-blokiruyut-po-zhalobe-mininforma

https://baj.by/be/content/po-trebovaniyu-genprokuratury-rf-vkontakte-zablokiroval-stranicu-zerkala

https://baj.by/be/content/vkontakte-zablokiroval-stranicu-belorusskoy-mediazony-v-rossii

пабудаваны на рэтрансляцыі праграмаў расійскага тэлеканала РБК і здымцы ўласных праграмаў на беларускую тэматыку[27].

22 верасня выйшаў апошні нумар газеты «УзГорак». Па не паведамленых публічна прычынах рэдакцыя вырашыла прыпыніць выхад друкаванага выдання пасля 12 гадоў працы[28].

# Падзеі ў дзяржаўным медыясектары

26 жніўня міністр інфармацыі Уладзімір Пярцоў заявіў, што досвед стварэння медыяхолдынга ў Мінскай вобласці будуць укараняць ва ўсіх рэгіёнах краіны, бо «сёння гэта адзіная магчымасць утрымаць ва ўмовах трансфармацыі аўдыторыю сваіх раёнаў». Маецца на ўвазе стварэнне ўзбуйненых рэдакцыяў для раённых дзяржаўных газетаў з цэнтральным кіраваннем і адзінай рэдакцыйнай палітыкай[29].

Адыёзныя беларускія прапагандысты зазналі абмежаванні з боку кампаніі Apple, якая заблакавала доступ праз краму прыкладанняў App Store да Telegram-каналаў супрацоўніка СТВ Рыгора Азаронка і супрацоўніцы «Беларусь-1» Ксеніі Лебедзевай у сувязі з наяўнасцю «паклёпніцкага, дыскрымінацыйнага ці подлага кантэнту», і кампаніі Meta, якая заблакавала старонку Рыгора Азаронка ў Facebook.

[27] https://baj.by/be/content/prekratil-veshchanie-telekanal-belbizneschenel

[28] https://horki.info/news/21017.html

[29] https://mlyn.by/26082022/opyt-sozdaniya-mediaholdinga-v-minskoj-oblasti-budut-vnedryat-vo-vseh-regionah-strany-perczov/

Міністэрства інфармацыі Беларусі, якое пастаянна ініцыюе блакіроўку сайтаў незалежных СМІ, у адмысловай заяве назвала гэтыя дзеянні «удушэннем свабоды слова»[30].

**Сталі вядомыя выпадкі жорсткай цэнзуры ў дзяржаўных СМІ.**




Так, галоўны рэдактар барысаўскай раённай газеты «Адзінства» Кацярына Вараб'ёва была вымушаная звольніцца пасля таго, як яна ў інтэрв'ю праўладнаму блогеру паскардзілася на праблемы райцэнтраў[31].

На «Гомельскім гарадскім радыё» звольнілі некалькіх супрацоўнікаў, у прыватнасці радыёвядучых Арцёма Забірана і Яраслава Бычкоўскага. Іх абвінавацілі ў падтрымцы пратэстуючых у 2020 годзе, пасля таго як яны ў эфіры 11 кастрычніка павіншавалі з днём народзінаў расійскага незалежнага журналіста і відэаблогера Юрыя Дудзя (некалькі ягоных відэа былі прызнаныя ў Беларусі «экстрэмісцкімі матэрыяламі»), а ў іх у сацсетках знайшлі крамольныя публікацыі[32].

---

[30] https://mediazona.by/news/2022/09/23/ios
https://news.zerkalo.io/cellar/24221.html?c
https://baj.by/be/content/blakirouka-telegram-kanalau-udushenne-svabody-slova-mininfarm-zaklapaciusya-svaimi-ruparami

[31] https://nashaniva.com/297953

[32] https://baj.by/be/content/v-gomele-uvolili-neskolkih-sotrudnikov-gosradio-odin-iz-nih-v-pryamom-efire-pozdravil-s-dnem

Тэлеканал «Гродна Плюс» з гэтай жа нагоды прынёс выбачэнні гледачам: на тэлеканале паведамілі, што 11 кастрычніка інжынер відэамантажу выпусціла ў ранішні эфір архіўны запіс 2019 года рубрыкі «Асоба дня», дзе гаворка вялася пра Юрыя Дудзя. Тэлеканал выказаў падзяку тэлегледачам «за пільнасць», бо «падобнай інфармацыі не месца ў эфіры дзяржаўнага тэлеканала»[33].

[33] https://news.zerkalo.io/life/23905.html?c

**«БЕЛАРУСКАЯ АСАЦЫЯЦЫЯ ЖУРНАЛІСТАЎ»**

[www.baj.by](http://www.baj.by)

Змест гэтага электроннага выдання абаронены нормамі Аўтарскага права.
Спасылка на «Беларуская асацыяцыя журналістаў» пры выкарыстанні матэрыялаў ЭЛЕКТРОННАГА БЮЛЕТЭНЯ «СМІ Ў БЕЛАРУСІ» з'яўляецца абавязковай.

Кантакт:
Бастунец Андрэй Леанідавіч

E-mail: press@baj.by
Web: www.baj.by